Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

DOI:10.17951/sb.2023.17.11-26
Studia Białorutenistyczne 17/2023 HISTORY, CULTURE AND SOCIOLOGY
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Uladzimir Lobach

Independent researcher (Belarus)
e-mail: nordic972@gmail.com
https://orcid.org/0000-0002-1877-8107

Антрапалогія калабарацыі: вобраз дапаможнай паліцыі ва ўспамінах вяскоўцаў паўночнай Беларусі пра нацысцкую акупацыю 1941–1944 гг.

Anthropology of Collaborationism: the Image of the Auxiliary Police in the Memory of the Villagers of Northern Belarus during the Nazi Occupation of 1941–1944

Antropologia kolaboracji: obraz policji pomocniczej w pamięci mieszkańców wsi północnej Białorusi o okupacji nazistowskiej w latach 1941–1944

Abstract

The article is devoted to the analysis of the oral history materials which reflect the attitude of the villagers of northern Belarus to the local police during the Nazi occupation. The research shows local people's interpretation of the motives and reasons for joining the police, evaluation of the activities of collaborators and opinions about their methods of punishment. With the generally negative attitude of the villagers towards the police, the main emphasis within the local rural communities was placed on the specific actions and behaviour of the police towards the local community. Those collaborators who took part in punitive actions and robberies left in the memory features categorically negative («worse than the Germans»). In anthropological terms, such a harsh assessment is based on the absolute rejection of the person, who was «theirs», but went to the side of «others», for violence against fellow residents, neighbours, and even relatives. The research methodology is interdisciplinary and is based on the theoretical and practical approaches to field ethnography, oral history, anthropology of war and microhistory.

Keywords: Nazi occupation, police, villagers, northern Belarus, oral history, anthropology of war

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

Abstrakt

Artykuł jest poświęcony analizie materiałów historii mówionej, które odzwierciedlają stosunek mieszkańców wsi północnej Białorusi do funkcjonariuszy policji spośród miejscowej ludności w okresie okupacji nazistowskiej. Badanie prezentuje ludową interpretację motywów wstępowania w szeregi policji, ocena działań kolaborantów oraz opinię na temat ich karania. Przy generalnie negatywnym nastawieniu mieszkańców wsi do policjantów, w lokalnych społecznościach wiejskich główny nacisk położono na konkretne działania i zachowania policjantów w stosunku do lokalnej społeczności. Tych kolaborantów, którzy brali udział w akcjach karnych i rabunkach, charakteryzowano we wspomnieniach zdecydowanie negatywnie („gorsi niż Niemcy"). W wymiarze antropologicznym taka surowa ocena opiera się na absolutnym odrzuceniu osoby, która była „swoją", ale przeszła na stronę „obcych", stosując przemoc wobec współmieszkańców, sąsiadów, a nawet krewnych. Metodologia badań ma charakter interdyscyplinarny i opiera się na teoretycznych i praktycznych podejściach etnografii terenowej, antropologii wojny, historii mówionej i mikrohistorii.

Słowa kluczowe: okupacja nazistowska, policja, mieszkańcy wsi, północna Białoruś, historia mówiona, antropologia wojny

Анатацыя

Артыкул прысвечаны аналізу матэрыялаў вуснай гісторыі, якія адлюстроўваюць стаўленне вяскоўцаў паўночнай Беларусі да паліцэйскіх з ліку мясцовага насельніцтва ў часе нацысцкай акупацыі. Даследаванне паказвае народную інтэрпрэтацыю матываў і прычын уступлення асобных людзей у шэрагі паліцыі, ацэнку дзейнасці калабарантаў і меркаванне адносна іх пакарання. Пры агульна негатыўным стаўленні вясковых жыхароў да паліцэйскіх, у межах лакальных вясковых супольнасцяў асноўны акцэнт рабіўся на канкрэтных учынках і паводзінах паліцэйскіх у дачыненні да мясцовай грамады. Катэгарычна адмоўную характарыстыку ва ўспамінах („горш за немцаў") маюць тыя калабаранты, якія ўдзельнічалі ў карных акцыях і рабунках. У антрапалагічным вымярэнні такая жорсткая ацэнка грунтуецца на абсалютным непрыняцці чалавека, які быў „сваім", але перайшоў на бок „чужых" дзеля гвалту над аднавяскоўцамі, суседзямі і нават сваякамі. Метадалогія даследавання мае міждысцыплінарны характар і грунтуецца на тэарэтычных і практычных падыходах палявой этнаграфіі, вуснай гісторыі, ваенна-гістарычнай антрапалогіі і мікрагісторыі.

Ключавыя словы: нацысцкая акупацыя, паліцыя, вяскоўцы, паўночная Беларусь, вусная гісторыя, антрапалогія вайны

Homo belli і антрапалогія вайны. Праблематыка II Сусветнай вайны застаецца актуальнай як для беларускай, так і для еўрапейскай гістарыяграфіі ў цэлым. Колькасць даследаванняў, прысвечаных розным аспектам трагічных падзей 1939–1945 гг, якія выдаюцца ў розных краінах, не паддаецца злічэнню. Але важным стае тое, што, апрача пашырэння факталагічнай базы і новых тэматычных напрамкаў, у апошнія дзясяцігоддзі выяўляецца і новая

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

парадыгма ваеннай гісторыі, звязаная з антрапалагізацыяй гістарычнай навукі ў цэлым. На змену „буйному маштабу" вывучэння вайны, дзе фігуруюць маршалы, франты ды арміі, прыходзіць індывідуалізацыя прадмета даследавання, калі галоўная ўвага надаецца Homo belli – Чалавеку вайны, з далейшай дэталізацыяй: салдат у акопах, ваеннапалонны, остарбайтэр, партызан, жыхар вёскі ці горада ва ўмовах акупацыі альбо ў зоне тыла; дзеці і дарослыя, мужчыны і жанчыны. Ваенна-гістарычная антрапалогія, якая сфармавалася ў пачатку 2000-х гг. як самастойная навуковая дысцыпліна, адпачатку дэкларавала свой інтэгратыўны характар, калі дзейснымі сталіся тэарэтычныя мадэлі і падыходы ваеннай гісторыі, псіхалогіі, культурнай антрапалогіі, сацыялогіі. Вялікае значэнне ў рамках новай дысцыпліны надаецца даследаванню вобраза ворага і эвалюцыі паняццяў „свой – чужы" ў экстрэмальных умовах вайны.

У сваю чаргу, даследаванне псіхалагічных і ментальных рэакцый, бачання, азначэнняў і інтэрпрэтацый падзей, сведкамі якіх стаў Чалавек вайны, немагчымае без непасрэднага звароту даследчыка да яго самога, што можа быць рэалізавана ў рамках „вуснай гісторыі" (oral history). Пры гэтым вядзецца не толькі пра атрыманне новай інфармацыі адносна мінулых падзей. „Сёння даследчыка вуснай гісторыі больш чым пошук фактаў займае спроба зразумець сэнс (або сэнсы), які людзі надаюць тым ці іншым фактам і які прысутнічае і часта дамінуе ў працэсе прыпамінання" (Smalianchuk, 2016, s. 174).

Для Беларусі і іншых краін Еўропы, у якіх II Сусветная вайна асацыяваная з жудасцю нацыскай акупацыі, актуальнымі стаюць сведчанні людзей, якія яе перажылі. „Самастойным накірункам у рамках „вуснай гісторыі" II Сусветнай вайны з'яўляецца вывучэнне палітыкі нацынаял-сацыялістаў у акупаваных абласцях і рэакцыі на яе мясцовага насельніцтва. Асаблівая ўвага надаецца гісторыі супраціву і калабарацыянізму" (Chiary, 1996, s. 250). Запатрабаваным стае такі накірунак вуснай гісторыі як anti-history (анты-гісторыя), дзе „на першым плане аказаўся пастулат аднаўлення справядлівасці шляхам прадстаўлення слова прайграўшым, непрывілеяваным, маргіналізаваным, забытым і выключаным з жыцця" (Kurkowska-Budzan, 2016, s. 165). У нашым выпадку размова ідзе пра т.зв. „маўклівую большасць" – беларускіх вяскоўцаў, вызначаных як „мірнае" ці „грамадзянскае насельніцтва", галасы якіх не браліся пад увагу акадэмічнай навукай, бо не адпавядалі ідэалагеме „гераічнай барацьбы". Выключэнне складаюць гісторыі спаленых вёсак, але трагічны досвед жыцця ў часе нацысцкай акупацыі мільёнаў беларусаў застаўся не ўключаным у афіцыйны наратыў Вялікай Айчыннай вайны.

Запознены зварот да фонда памяці Homo belli, які пачаў адбывацца толькі ў пачатку XXI ст., выявіў тую акалічнасць, што даследчык у пераважнай большасці выпадкаў мае справу з людзьмі, што ў часе вайны былі дзецьмі альбо падлеткамі. У першую чаргу ўвага была звернута на малалетніх вязняў канцэнтрацыйных лагероў і паднявольна забраных разам з бацькамі на прымусовыя працы ў Германію (Detstvo vojny, 2011). Аднак „дзеці вайны", якія ў Беларусі (у вёсках,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

мястэчках, гарадах) сталіся сведкамі акупацыйнага рэжыму нацыстаў, дагэтуль непачутыя.

> Паколькі ў афіцыйным савецкім дыскурсе панавалі сюжэты пра гераічныя подзвігі маладых камсамольцаў і піянераў і іх ролі ў барацьбе з ворагам, камунікатыўная памяць дзяцей аб паўсядзённым жыцці падчас акупацыі не была запатрабаваная і заставалася „замоўчанай гісторыяй" (silent history). Апавяданні „дзяцей вайны" пра свой „негераічны" вопыт на працягу дзясяцігоддзяў не былі ўключаныя ў грамадскі дыскурс аб вайне (Rebrova, 2014, s. 81).

Спецыфіка вясковага ўспрыняцця вайны і акупацыі ва ўмовах беларускай аграрнай супольнасці 1940-х гг. мае некалькі сутнасных рысаў. Вясковец (як дзіця, так і дарослы) вымярае „свой свет" уласным домам – вёскай – бліжэйшымі ваколіцамі, што адпаведным чынам выяўляецца і ў структуры ўспамінаў, дзе вылучаюцца тры ўзаемазвязаных лініі: асабістая – сямейная – вясковая гісторыя. Бітвы пад Масквой ці Сталінградам, пры ўсёй іх аб'ектыўнай значнасці для вынікаў II Сусветнай вайны, для жыхара лясной полацкай вёскі – падзеі невядомыя, бо ўся вайна, ад прыхода немцаў да іх выгнання, разгортваецца на ягоных вачох і толькі ў межах ягонага свету.

Другой асаблівасцю вясковага наратыву з'яўляецца „антыгістарычнасць", калі пад гэтым разумець ігнараванне ці маргіналізацыю храналагічнага прынцыпу, які ёсць базавым для пісьмовай гісторыі. На першы план у апавяданнях пра вайну заўжды выходзіць прэцэдэнт, знакавая падзея ці з'ява (пачатак і канец вайны, карная экспедыцыя, Халакост, гвалтоўны згон у Нямеччыну, голад і да т.п.), у той час як канкрэтныя даты могуць увогуле не называцца альбо быць вельмі прыблізнымі ці пераблытанымі.

Насычанасць „вясковага тэкста" пра вайну фальклорнымі матывамі і інтэрпрэтацыямі складае яшчэ адну адметнасць успамінаў сялян. Прарочыя знакі і сны пра пачатак і канец вайны, дзівосныя праявы Бога (Божай Маці), „цуд выратавання", рытуальныя спосабы нейтралізацыі смяротнай пагрозы (абыдзённая намітка, хросныя хады, абраканні), уяўленні пра „жыдоўскае золата" і фальклярызацыя вобразаў немцаў, паліцэйскіх, партызанаў – не проста рэплікі міфапаэтычнай карціны свету, але інтэгральныя элементы складанага соцыякультурнага механізму пераадолення традыцыйнай супольнасцю экстрэмальнай, смяротна небяспечнай сітуацыі. З другога боку, народнае апавяданне пра вайну пазбаўлена ідэалагічных канструктаў і пафасу, уласцівых „прафесійнай гісторыі", бо біяграфічны наратыў не закліканы ў чымсці пераконваць і штосці даказваць, але выяўляе лёс чалавека і калектыва ў сістэме базавых аксіялагічных катэгорый „дабро" і „зло". Як адзначыла А. Энгелькінг,

> у гэтым апавяданні ўтрымліваецца вобраз свету, створаны групай, якая не спараджае гістарычных і палітычных ідэалогій: гэта яе ўласныя сэнсы, каштоўнасці і нормы, якія

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

> фармуюць грамадска-культурны космас і слугуюць крыніцай семіятычных катэгорый інтэрпрэтацыі рэчаіснасці (Engelking, 2018, s. 28).

Дзіцячыя ўспаміны пра вайну наследуюць механізмы і прынцыпы ментальнага засваення і вытлумачэння рэчаіснасці, уласцівыя для дарослых, але маюць і ўласную спецыфіку. Важным стае ўзрост дзіця (падлетка), у якім яно апынулася сведкам ваенных падзей. „Па сцвярджэнні псіхолагаў, сацыяльная памяць пачынае фармавацца ужо з 4-гадовага ўзросту і ўключае ў сябе шматковыя найбольш эмацыйна афарбаваныя эпізоды знешняга ў адносінах да яго жыцця. Больш асэнсаванымі, суаднесенымі з гістарычным кантэкстам дзіцячыя ўспаміны становяцца ў 9-гадовым узросце" (Rebrova, 2014, s. 282). Агульнае месца дзіцячых успамінаў – выразны сямейны кантэкст апавяданай гісторыі. Палявыя даследванні паказалі, што, чым меншым быў узрост рэспандэнта ў часе вайны, тым больш у ягоных успамінах фігуруюць сваякі і, асабліва, маці. У сваю чаргу, ранняе сталенне ва ўмовах вайны, калі дзеці актыўна ўключаліся ў працэсы жыццязабеспячэння сям'і, фармуе асобную „я-гісторыю" ўжо ў 8–10-гадовым узросце.

У адрозненне ад дарослых, дзеці ў меншай ступені ўсведамляюць смяротную пагрозу ў крытычных сітуацыях, выяўляюць куды большую і непасрэдную цікаўнасць да нямецкіх салдат і іх тэхнікі (апошняе характэрна для „успамінаў хлопчыкаў"), звяртаюць увагу на рэчы, неістотныя для старэйшых (цукеркі, незвыклая ежа), што знаходзіць свае адлюстраванне ў вусных успамінах, дзе „сэнсарная памяць пераважае над кагнітыўнай" (Ryblova, 2015, s. 96), калі пахі, гукі і смакі, звязаныя з ваеннай рэчаіснасцю прыгадваюцца надзвычай ярка.

Прадметам даследвання выступілі вусныя ўспаміны вяскоўцаў Віцебшчыны пра перыяд нацысцкай акупацыі ў той іх частцы, дзе адлюстраваны вобраз (калектыўны альбо персанальны) дапаможнай паліцыі і стаўленне да яе мясцовага насельніцтва. Асноўны корпус крыніц склалі матэрыялы экспедыцый (запісаныя і транскрыбаваныя інтэрвью), праведзеных Цэнтрам вуснай гісторыі і палявых даследванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў перыяд 2000–2020 гг. У пераважнай колькасці выпадкаў рэспандэнтамі былі жанчыны 1925–1930-х гадоў нараджэння, з пачатковай альбо сярэдняй адукацыяй, чыё дзяцінства (юнацтва) прыпала на перыяд нацысцкай акупацыі Беларусі. Апытанне праводзілася ў форме біяграфічнага інтэрвью з акцэнтацыяй (пашырэннем) асобных тэматычных блокаў (экстрэмальная гастранамія, Халакост, народная медыцына ды інш.), якія выяўляліся ў часе размовы.

Паліцыя ў народным успрыняцці. **Дабраахвотнікі**. Калабарацыянізм, як супрацоўніцтва з пануючым рэжымам, на тэрыторыі акупаванай нацыстамі Беларусі меў разнастайныя формы і праявы, але ў фокусе нашай увагі будзе дапаможная паліцыя – людзі, пераважна з ліку мясцовага насельніцтва, якім акупанты даверылі зброю для аховы „новага парадку". Акцэнт на зброі зроблены

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

невыпадкова, бо ў вясковым свеце яна была з'явай выключнай, анамальнай, асацыяванай з ідэямі улады, гвалту і смерці. Зброя ў руках аднавяскоўца, атрыманая з дазволу акупацыйных уладаў, рэзка вылучала яго сярод астатняй грамады і давала ўладальніку неабмежаваную ўладу над сваімі суседзямі. З'яўленне ў вёсцы „свайго" паліцэйскага расцэньвалася вясковай супольнасцю не з палітычнага ці ідэалагічнага гледзішча, але як небяспечны прэцэдэнт, які разбураў адзінства вясковай грамады, згуртаванай па прынцыпе „свае – чужыя".

„Чалавек са зброяй" пачынаў разглядацца як праваднік чужой волі і патэнцыйная крыніца небяспекі. Знакавы характар мела тое, якім спосабам чалавек апынуўся ў паліцыі: па сваёй волі альбо па прымусу.

Сітуацыя вайны мяркуе з'яўленне новых сацыяльных роляў, новай стратыфікацыйнай сістэмы ў вясковай супольнасці, якая апынулася на акупаванай тэрыторыі. У прыватнасці, узнікаюць магчымасці для падвышэння (няхай і часовага) свайго статуса. Пры гэтым у апавяданнях ухваляюцца „кар'еры", зробленыя міжволі, па збегу абставінаў і не ўхваляюцца такія, якія былі вынікам асабістага рашэння (Kormina, Štyrkov, 2005, s. 228).

Калі чалавек у самыя першыя дні акупацыі публічна дэкларавaў сваю прыхільнасць да акупантаў і жаданне служыць новай уладзе, гэта выклікала калектыўнае асуджэнне (галоснае ці негалоснае) і перасцярогу ў далейшых стасунках.

> Быў чалавек адзін такой… Ён выйшаў з хлебам к ім. К немцам. З соллю, з хлебам. Усе людзі на няго зарыкалі, замахалі […] А ён: „Мы вас, паночкі, ждалі". […] Людзі дужа яго тады карылі і больше яны гэтага старога чалавека не прізнавалі (FAPSU, 1).

Трэба меркаваць, што большасць дабраахвотнікаў пайшла ў паліцыю яшчэ ў 1941 г. „У першы час, як гэта бачна са шматлікіх дакументальных сведчанняў і, перш за ўсё, заяў на ўступленне ў паліцыю, дабраахвотнікі ішлі туды свядома, убачыўшы ў немцах вызваліцеляў ад бальшавізму, калгасаў і іншых адмоўных праяў савецкага ладу" (Litvin).

Матывацыя людзей, якія дабраахвотна ішлі служыць у паліцыю, магла быць рознай. „У шэрагу выпадкаў людзі ішлі ў паліцыю, адчуўшы на сабе савецкія злоўжыванні і рэпрэсіі", некаторым „служба ў паліцыі давала магчымасць зводзіць даўнія рахункі", немалаважнай была і прага матэрыяльнага ўзбагачэння (Chiary, 2008, s. 186). Але ў любым выпадку ўласныя памкненні служыць „новаму парадку" абслугоўвалі прагу ўлады, што ў рэальным вымярэнні вясковага (і не толькі) свету азначала магчымасць ужываць гвалт у дачыненні да безабаронных людзей.

> Была тада, была паліцаям дана бальшая власць, ані тожэ трэбавалі, што хацелі дзелалі. Маглі ўбіць чалавека, маглі, гэта самае, растраляць ні за што. Власць была ім дана, бальшая власць была дана. Эта былі і месные, былі і месные людзі (FAPSU, 2).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

„**Сваі горшыя за немцаў**". Параўнанне салдат вермахта з іх памагатымі з ліку мясцовай дапаможнай паліцыі даволі часта сустракаецца ва ўспамінах. Нярэдкімі ёсць выпадкі, калі паліцыя характарызуецца куды горш, чым уласна немцы.

> О, не, у нас (немец) нікога не растраляў, толькі паліцыя гэта. Ніхто з немцаў не знаў, хто камуніст, ніхто з немцаў не знаў, хто чым занімаўся да вайны. А месныя (паліцаі) ўсе ж зналі, ну вот дакладывалі немцам і немцы стралялі (FAPSU, 3); Што нашы (паліцаі) дзелалі, не дай Бог! Немцы і то лучше былі (FAPSU, 4).

Падобная акалічнасць фіксуецца даследчыкамі не толькі на Віцебшчыне, але практычна на ўсёй тэрыторыі акупаванай Беларусі. „Свае" паліцыянты як забойцы даволі часта фігуравалі ў вусных успамінах жыхароў беларускіх вёсак. Часам менавіта яны, а не нямецкія акупанты, выступалі як галоўнае зло апошняй вайны" (Smalânčuk, 2016, s. 180). Можна меркаваць, што найбольшай жорсткасцю вылучаліся тыя людзі, якія пайшлі служыць у паліцыю дабраахвотна. „Былі і сваі паліцыянты. Некаторых прымушалі сілай, тыя да людзей (адносіліся) няблага, а тыя, якія пайшлі самі, тыя дапамагалі немцам жыдоў забіваць" (Engelking, 2021, s. 239).

Небяспека з боку мясцовых паліцыянтаў заключалася ў тым, што яны цудоўна ведалі сацыяльны ландшафт вёскі, гісторыю кожнай сям'і, погляды людзей і іх маёмасны стан у той час, як „працэсы, што адбываліся ўнутры вёсак, для нямецкае адміністрацыі былі таямніцай за сямю пячаткамі" (Chiary, 2008, s. 171–172). „Свае" паліцаі выдатна ведалі мясцовасць, а таксама сялянскія спосабы ўхавання маёмасці, што рабіла іх незаменнымі памагатымі ў карных экспедыцыях, рэквізіцыях і рабунках. „Адзін пайшоў (у паліцыю), Сашкай звалі. Ну і пайшоў, і служыў немцам. Немец прыедзе, але ж не знае, дзе ў лесе зямлянкі, дзе што. Былі даводчыкі гэткія. Ну, гэткія былі людзі. Дык ён і быў з імі, у дзярэўню не прыхадзіў, быў ў Докшыцах" (FAPSU, 5).

Дабрахвотнікі, якія зрабілі „кар'еру" ў паліцыі, ва ўспамінах людзей фігуруюць не проста як жорсткія людзі, але як персоны, схільныя да садызму і катаванняў. Страх, што выклікалі такія паліцыянты тлумачыўся тым, што яны парушалі практычна ўсе нормы і ўсталяванні вясковай грамады і, застаючыся „сваімі" з паходжання, аблічча, мовы, у вачох сялян пераставалі быць людзьмі. „У сялянскім ўспаміне, дзе распавядаецца пра членаў уласнай суполкі, якія адкінулі дзеючыя ў іх нормы сацыяльнай маралі, парушалі правілы вясковай салідарнасці, пераступілі табу на забойства, — у цэнтры ўвагі тыя, хто *свой* і адначасова ўжо сваім не ёсць, ужо не такі. Пра тых, хто стаў унутраным чужынцам: *сваім* здраднікам" (Engelking, 2021, s. 236).

> Яго звалі Папян, ён камандаваў карацельным атрадам тады. Ён Юстыне жару ў вочы сыпаў, с печкі дастаў і ў ліцо жару ўсыпаў... Ён іздзеваўся над людзьмі. Яго наградзілі за

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

> „харошую работу", чэрапам награждаюць жа, на галаву чэрап чалавечаскі, як награда ягоная (FAPSU, 6).

> У дзярэуні Тупічана там быў начальнік паліцыі. Фамілія яго Бураў. І тады такі быў, што ён прыхадзіў у дамы і з ім былі сабакі аўчаркі у яго. І вот еслі яму не нравіцся гэты чалавек, ён прахадзіў і дажэ пускаў аўчарак. Аўчаркі разорвалі гэтых (людзей), і дзяцей, усіх. Ой, страхаццё, страхаццё! (FAPSU, 7).

Натуральна, што ўсе злачынствы паліцыянтаў супраць мірнага насельніцтва здзяйсняліся з ухвалы нямецкіх уладаў, якія былі зацікаўлены ў выкарыстанні калабарантаў дзеля рэалізацыі палітыкі тэрору і застрашэння. „Нямецкі бок раздзьмуваў канфлікты не толькі паміж беларусамі, палякамі, расійцамі ды габрэямі, але і паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных асяродкаў, паміж вяскоўцамі і гараджанамі, сялянамі і паліцыянтамі. Гэта вяло да разбурэння сістэмы каштоўнасцяў, сацыяльных і культурных повязяў, а таксама да ўзмацнення ўсеагульнай жорсткасці і бязлітаснасці" (Chiary, 2008, s. 21). Невыпадкова, што карныя акцыі нацыстаў часта праводзіліся пры непасрэдным удзеле дапаможнай паліцыі.

> Ну, немцы прыйшлі тут у дзярэўню, сюды ў нашу. Ну, а тады там паліцаі былі з імі, і яны, немцы, далі выпіць гэтым паліцаям. І яны прыйшлі і тут людзей стралялі, хаты палілі (FAPSU, 8). А патом што, ну патом началі месная паліцыя, эта ўжэ беларуская, ну тада рэпрэсіі началі, растрэліваць очэнь многа народу сталі, каждый дзень пачці тут у парк вадзілі (FAPSU, 9)

Асаблівую нянавісць у паліцыянтаў выклікалі партызаны і іх сем'і. У сваю чаргу, партызаны палявалі на калабарантаў, уключна з іх блізкімі сваякамі. „Неабходна адзначыць, што супрацоўніцтва з немцамі, удзел у мясцовай паліцыі і, асабліва, у беларускай, жорстка пераследвалася савецкім і польскім рухам Супраціўлення. Паліцэйскія і іхнія сем'і, як правіла, знішчаліся, а іх дамы спальваліся" (Litvin). Такі жорсткі накал змагання паміж „ляснымі мсціўцамі" і мясцовымі паліцэйскімі аддзеламі абумоўлены не толькі ідэалагічнымі разыходжаннямі ды ўзаемнымі абвінавачаннямі ў „бандытызме" альбо „здрадзе", колькі барацьбой за ўладу ў беларускай вёсцы. Варта ўлічваць, што мясцовая паліцыя была зусім не малалікай купкай калабарантаў, але па сваёй колькасці прыблізна адпавядала колькасці партызанаў. Калі пастаянна ці часова на тэрыторыі Беларусі знаходзілася каля 180 тысяч паліцэйскіх, 120 тысяч з якіх складала мясцовая дапаможная паліцыя (Detstvo vojny, 2011, s. 29), то, паводле дадзеных Беларускага штаба партызанскага руху, па стане на 01.06.1944 г. на тэрыторыі рэспублікі налічвалася 142 558 партызанаў (Musâl, 2018, s. 396). Паводле падлікаў Б. К'яры, у шэрагу рэгіёнаў Беларусі сярод забітых партызанамі каля 90 % складалі прадстаўнікі мясцовай паліцыі (Chiary, 2008,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

s. 21). Па сутнасці, „акупацыя стварыла ўмовы для грамадзянскай вайны паміж беларусамі", якая падзяліла не толькі вясковую супольнасць, але і асобныя сем'і (Mironowicz, 215, s. 104).

А там у Шнітках былі ў міліцыю (паліцыю) пайшоўшы, знаеце. А парцізаны прыхадзілі, тады палілі, траслі гэтых людзей. Да нас хаваліся гэтыя рабяты ў хату. Ну, хаваліся абыкнавенныя людзі, а іх сын у паліцыю быў пайшоў. А парцізаны прыхадзілі стралялі над галовамі. Ой, што было! Парцізаны і паліцыя, і чорт яе знаіць, куды дзецца... Адны ў парцізанах, а адны ў паліцыю пайшлі (FAPSU, 10). У нас была: адзін брат у парцізанаў, другі ў немцаў. Так было вот (FAPSU, 11).

Нянавісць і страх перад расправай рабіў паліцыянтаў безлітаснымі ў дачыненні да тых, хто па іх меркаванні хоць нейкім чынам быў звязаны з партызанамі. Ва ўспамінах вельмі часта ўзгадваецца гвалт і забойствы паліцыянтамі безабаронных людзей, якія былі блізкімі сваякамі партызанаў альбо дапамагалі рэальна ці ўяўна.

> Ну вот, паліцаі во ў этай, у Гародна, там вот парцізанскія сем'і паліцаі расстрэльвалі там на еврейскім кладбішчы, етыя астровенскія паліцаі (FAPSU, 12).

> А тады ўжо немцы, і паліцаі, і немцы этыя, пашлі па балотам дзелаць чыстку і с аўчаркамі. Што немец, то сабака. І вот забіралі нас з этага балота, і паліцаі настаівалі, каб нас растрэлялі. Так і гаварылі: „Эта партызанскіе сучкі, іх нада парастрэляць" (FAPSU, 13).

Халакост. Чорнай старонкай гісторыі беларускай дапаможнай паліцыі ў часе нацысцкай акупацыі стаў яе ўдзел у індывідуальных альбо калектыўных расправах над яўрэямі. Ва ўспамінах пра Халакост мясцовыя паліцыянты фігуруюць як канваіры яўрэяў да месца экзэкуцыі, арганізатары ўхавання злачынства (зганялі мясцовых людзей выкопваць і закопваць растрэльныя ямы), непасрэдныя ўдзельнікі масавых растрэлаў і як індывідуальныя забойцы яўрэяў, што здолелі ўцячы з гета.

І як там прыляцелі гэтыя паліцаі туды. Такі тут із Жукоў, такі Вацлаў Рубніковіч. Каб яму на том свеце месца не было! А як жа ж яны яго там знайшлі? Ай, каб вы відзілі, што яны робілі! Як наставяць руж'ё і міма стрэльнуць, а гэтаж яўрэйка валасы на сабе ірвець, а гэтыя рабяткі падаюць. Ай, як яны мучылі! У мяне і цяпер гэта сцэна ў вачах стаіць. А тады і гэтага Міхола. А тады гэтак ужо яна ўжо без памяці стала, завалілася, ляжыць, а яны тады разрыўнымі пулямі, як далі ў галоўку. Толькі гэтыя кусочкі крыві, чарапочкі на дзверы ляцелі (FAPSU, 14).

У падобных гісторыях у якасці злачынцаў часта фігуруюць не ананімныя паліцаі, але людзі добра знаёмыя: з суседняй вёскі, альбо нават з суседняй хаты, што толькі падкрэслівае жудасную метамарфозу, калі яшчэ нядаўна „свой" чалавек ператвараецца ў забойцу нявінных людзей і, адпаведна, становіцца „чужым".

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

> А большы дзелалі плоха паліцаі. Во што. Паліцаі былі... Яўрэйка адна з дачкой хадзіла па дзярэўне, ну і яна скрывалася. Ну, тады дзелала так, што шыла з дочкай, шыла, хадзіла па хатам. І тут вунь з гэтай хаты, што вунь стаіць хата, зяць іхный. Узнаў і прыйшоў, забраў яе і во тут во быў мосцік, дарога, вывеў і растраляў (FAPSU, 15).

„Каб добра жыць”. Ва ўспамінах пра перыяд нацысцкай акупацыі рэспандэнты практычна нічога не паведамляюць пра знешні воблік, асабістыя характарыстыкі і матывы тых, хто дабраахвотна пайшоў служыць немцам. Бадай адзіным выключэннем ёсць указанне на прагу ўзбагачэння за кошт іншых людзей. „Увогуле, апытаныя, калі і паказваюць нейкія матывы паліцыянтаў, кажуць пра матэрыяльныя памкненьні” (Engelking, 2021, s. 239). У вусных успамінах падобная матывацыя апісваецца сцісла – „каб добра жыць”: „*Нашы месныя жыцелі шлі ў паліцаі, каб ім добра жыць (было). На чорта яму хувацца ад немца? Ён пайшоў служыць немцу, памагаў яму*” (FAPSU, 16). Але ў часе акупацыі „добрае жыццё” разумелася, перадусім, як адносная бяспека і дабрабыт, дасягнуць які на службе ў паліцыі можна было з дапамогай зброі і рабункаў.

> У нашай дзярэўні былі паліцаі, а паліцаяў у Ладасні тут поўна, у Камені было паліцаяў многа. І яны тады што робюць: прыедуць, абіраюць дзярэўню… І калаўроты бяруць, і адзежа, якая дзе была, і што ў каго была. […] І ўсё грузюць гэтаі паліцаі і вязуць у Камена ўсё. А кончылася вайна, нашы людзі дажа ўзнавалі адзёжу якую-небудзь, вешчы якія ўзнавалі, што пазвазілі паліцаі гэтыя (FAPSU, 17).

Трэба ўлічваць і тое, што гвалт паліцыянтаў у адносінах да мірнага насельніцтва меў не толькі маёмасную прагматыку. Ва ўспамінах фігуруюць выпадкі здзекаў і забойстваў на сэксуальнай глебе.

> Немцы былі і лепшыя, як нашыя паліцаі. Ехалі мы, не было чаго есці, і мы ішлі, во ездзілі сюды за хлебам. А во ляжала з Фралоў дзеўка забітая, яна ішла сюды во проста. Усё снялі і трусы і ў жывот палку пасадзілі. Гэта „народнікі”, паліцаі. А ў чым разніца, толькі па чым панялі: у немцаў была форма зялёная, светлая такая, а ў паліцаяў цёмна-сіняя, а гузікі белыя. І мы ехалі за хлебам і гэтая дзеўка ляжала голая, раздзетая, і палка ў жывот усаджаная, а гузік вырваны – білася, відаць, ужо знала яна, што яе смерць. І вот схвацілася за піджак і вырваўся гузік. Паліцэйскі гузік ляжаў каля яе. Во, толькі па чым панятна было (FAPSU, 18).

У паліцыі пад прымусам. **„Добры паліцай”**. Мясцовая дапаможная паліцыя складалася далёка не толькі з дабраахвотнікаў, якія сталі актыўнымі праваднікамі палітыкі гвалту і тэрору. „Ужо з сярэдзіны да канца 1942 г. амаль 50% новых паліцыянтаў... былі рэкрутаваныя прымусова” (Bartushka, 2014, p. 118). Тых, хто апынуўся ў паліцыі не па сваёй волі выразна адрозніваюць ад дабраахвотнікаў і рэспандэнты ў сваіх успамінах. Калі пайсці ў партызаны не было магчымасці, выбар у маладога чалавека, які дасягнуў прызыўнога ўзросту, быў невялікі:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

альбо ісці ў паліцыю, альбо быць вывезеным на прымусовыя працы ў Германію. „Местныя былі тожа у паліцыі... А маладыя шлі, а што у Германію не хацелі ехаць. Вот, хто 26-га, 25-га года (нараджэння), шлі ў паліцыю. Ну, каторыя шлі, а каторыя не шлі – у Германію саслалі" (FAPSU, 1).

Па зразумелых прычынах людзі, якія апынуліся ў паліцыі пад прымусам і не заплямілі сябе гвалтам і крывёю, шукалі першай магчымасці, каб пакінуць яе шэрагі. У большасці выпадкаў вялося пра пераход паліцыянтаў у партызанскія аддзелы, што дазваляла пазбегнуць адказнасці за калабарацыю з акупантамі.

> [А ці многа ў паліцыю ішло?] Ай, ну дужа не. Калі каторы ішоў, яны нічога врэднага (не рабілі), іх заставілі. [А што потым з імі рабілі, як ужо Саветы назад прыйшлі?] Нічога з імі не рабілі. Яны тады после ў парцізаны пашлі, тады на фронт, як асвабадзілі тут гэту меснаць… (FAPSU, 19).

Можна меркаваць, што менавіта такія паліцэйскія ўзгадваюцца ў народных наратывах пра акупацыю як „добрыя", схільныя да спагады адносна сваіх аднавяскоўцаў і здольныя на дапамогу ў крытычных сітуацыях. А. Энгелькінг пазначае, што „палескі аповяд пра вайну ведае і такія выпадкі, калі „свае" памагатыя нямецкіх уладаў не падлягаюць Боскаму пакаранню. Перш за ўсё гэтая тыя солтысы / старасты, якіх меркаванне сяла не адносіць да здраднікаў. Гэта людзі, якіх памятаюць, хутчэй, як выратавальнікаў" (2018, p. 38). Але апрача старастаў у якасці такіх выратавальнікаў фігуруюць і асобныя паліцыянты. Дапамога сваякам, суседзям, аднавяскоўцам ці добрым знаёмым магла мець розныя формы: папярэджанне пра карную акцыю ці выратаванне ад гвалтоўнага вывазу ў Германію, прадухіленне рэальнай небяспекі для роднай вёскі з боку немцаў.

> У нашай дзярэўні, дзе я радзілася, там быў паліцай, трохі ён спасаў ад немцаў эту дзярэўню. Мама ягоная тут жыла ў гэтай дзярэўні. [...] Ну, а так у нашай дзярэўні із-за гэтага паліцая дужа так не было, не ўбівалі людзей (FAPSU, 20).

> Паехалі мы ў Докшыцы... Так падхапілі мяне і ў вагон, а гэта яны... маладзёж ў Гэрманію адпраўлялі робіць. І тут у нас быў у паліцыі ў папы нейкі знакомы з Тумілавічаў, і тады папа пайшоў к гэтаму паліцэйскаму. Гэты паліцэйскі мяне выташчыў адтуда, з таго вагончыка, і сказаў „Убягіце, пакуль не позна" (FAPSU, 21).

Пакаранне. Матыў пакарання, які прысутнічае ў апавяданнях пра вайну, найперш датычыцца тых паліцыянтаў з ліку „сваіх" людзей, якія вызначыліся забойствамі і гвалтам. Незалежна ад таго, пра рэальную ці сімвалічную адплату вядзецца размова, галоўным яе вынікам стае выбаўленне „свайго свету" ад людзей, якія парушылі яго базавыя соцыякультурныя нормы і згубілі права лічыцца „сваімі". „Калі „свой-паліцай" не атрымаў фізічнага пакарання ў часе

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

вайны ці адразу пасля яе, альбо яму не быў вынесены пазней судовы прысуд, – яму не пазбегнуць сімвалічнай адплаты за смерць нявінных, паколькі ізаляцыя парушальнікаў (з выкарыстаннем механізму самасуду / праклёна / кары Божай) з'яўляецца умовай захавання культуры (Engelking, 2018, s. 38).

Спроба былога паліцая вярнуцца і наноў інтэгравацца ў вясковую супольнасць сканчаецца для яго паказальным выгнаннем ці пакараннем. Пры гэтым, акцэнтуецца матыў „вендэтты", калі адплата з боку людзей вызнаецца першаснай, у параўнанні з судовым выракам.

> Быў у нас знакомы паліцай... І гэтат паліцай прыехаў на сяло да мальчыка, якога на фронт яшчэ не бралі, і забраў яго, і яго там забілі. Тады ён, (як) кончылася вайна..., устроіўся на свінаферму падвожчыкам. А гэтага мальчыка швагра прышоў на ферму і прыгразіў яму. Казаў, што калі ўстрэціць яго аднаго дзе, то уб'ець. Ну і ён аж у Латвію ўцёк (FAPSU, 22).

> Ён (паліцай) прыехаў сюды к радне [...]. Парцізан увідзеў яго. Яго штоб у вайну прыхлопалі, но не было мамента. Той парцізан з застолля вылез, і пашол к яму... І пісталеты ў яго (партызана) ізвесна з вайны былі, было ж аружжа. Той дагадаўся, і тут у нас кусты былі, і ў кусты. Ну ён яго раніў толькі, не застрэліў, раніў. І яму, раненаму, дзесяць лет далі. Адсідзеў дзесяць лет у цюрме (FAPSU, 23).

Звяртае на сябе ўвагу адмысловая фальклярызацыя (дэманізацыя) вобразу злачынцы паліцая, уласцівая для традыцыйнай карціны свету, калі чалавек, вінаваты ў смерці аднавяскоўцаў, становіцца роўным чараўніку і суадносіцца з нячыстай сілай (Engelking, 2021, s. 246). Больш за тое, праклёне, атрыманае здраднікамі, пераходзіць і на іх нашчадкаў, якія працягваюць „чорную справу" сваіх бацькоў ужо ў мірны час.

> Прымерна, у мяне сын – у яго харакцер мяккі, ён не жэстокі, а у іх жа (дзяцей паліцая) у крыві ёсьць гэта зараза, у паліцаяў. [...] А тут во, чэраз гэту хату жывець, ейную матку парцізаны растралялі, яна прадацельніца была. І яе парцізаны убілі, а гэна, дачка ейная, засталася. І вот яна стала людзям мсьціць за эту матку. І наўчылась халеру гэтую ўсякую. Вот суседзі ў яе і павымерлі. Сем'ямі павымерлі! [...] Яе ўнук уваліўся у яму, у люк – і забіўся на сьмерць. Бог наказаў! Не нада людзям дзелаць дрэнна! Іх і завуць „паліцэйскія патомкі". Іх чэрці мучаюць (FAPSU, 23).

Зусім іначай вяскоўцамі трактуецца пакаранне судовай сістэмай тых, трапіў у паліцыю пад прымусам і ніякага зла людзям не чыніў. Матыў асабістай помсты (альбо Божага пакарання) ў дадзеным выпадку адсутнічае цалкам, а жорсткі судовы вырак успрымаецца як несправядлівы.

> Ну, паліцаі, сматра якія, былі і добрыя. Вот помню, тут с дзерэвні такі добры малец был добры. Тада ім жа па 10 лет давалі. Пасля вайны пасадзілі. А на этага пісалі многа

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

заяўленія саседзі, што ён очэнь харошы, што он не ўбівал, нікаво не прадавал. Былі ўсякія (FAPSU, 24).

Заключэнне. Аналіз матэрыялаў вуснай гісторыі, якія адлюстроўваюць бачанне вясковымі людзьмі рэалій нацысцкай акупацыі, паказваюць, што для традыцыйнай ментальнасці адной з трагічных праяў вайны ёсць крызіс і дэзарганізацыя вясковай супольнасці, калі з ліку „сваіх" вылучаюцца тыя, хто службу ў паліцыі выкарыстоўваў дзеля забойстваў і неабмежаванага гвалту. Дабраахвотны ўдзел паліцыянтаў у карных экспедыцыях супраць партызан і мірнага насельніцтва, катаваннях, растрэлах яўрэяў, татальных рабунках вяскоўцаў азначала для апошніх цяжкія злачынствы, несумяшчальныя са статусам і соцыякультурнымі нормамі „свайго" чалавека. Адсюль, у народных апавяданнях частым ёсць параўнанне „сваіх паліцаяў" з немцамі, дзе мясцовыя калабаранты, якія заплямілі сябе крывёю і гвалтам, выступаюць як большае зло, нават у параўнанні з акупантамі. Катэгорыя „свой" у дачыненні да паліцыянтаў-дабраахвотнікаў набывае фармальны характар, якая ўказвае на паходжанне чалавека і практычна не фігуруе ў апавяданнях пра пакаранне такіх людзей, асноўны сэнс якога – фізічнае альбо сімвалічнае знішчэнне (выдаленне) здрадніка, які стаў „чужым" ў межах лакальнай вясковай супольнасці.

Іншым было стаўленне да тых, хто апынуўся ў паліцыі пад прымусам, не чыніў ніякага зла і ў крытычных сітуацыях дапамагаў людзям. Пакаранне іх савецкай судовай сістэмай лічылася празмерна жорсткім і несправядлівым, што падкрэслівае спецыфіку народнага светаўспрыняцця і этыкі, калі ў сістэме традыцыйнай аксіялогіі на першае месца выходзяць учынкі чалавека, а не яго мундзір.

REFERENCES

Sources

FAPSU – Folklore Archive of the Polotsk State University[1]:
FAPSU 1. (2018). Ж., 1932 г.н., в. Сіроціна, Шумілінскі раён.
FAPSU 2. (2019). Ж., 1927 г.н., г. Дзісна, Мёрскі р-н.
FAPSU 3. (2016). Ж., 1936 г.н., в. Скобрае, Полацкі р-н.
FAPSU 4. (2013). Ж., 1930 г.н., в. Жарнасекава, Бешанковіцкі р-н.
FAPSU 5. (2009). Ж., 1931 г.н., в. Рачныя, Докшыцкі раён.
FAPSU 6. (2013). М., 1934 г.н., в. Клешчына, Бешанковіцкі р-н.
FAPSU 7. (2016). Ж., 1934 г.н., в. Шпакоўшчына, Полацкі р-н.
FAPSU 8. (2013). М., 1934 г.н., в. Жарнасекава, Бешанковіцкі р-н.

[1] Дзеля аховы персанальных дадзеных, замест прозвішча пазначаецца пол рэспандэнта: мужчынскі (М) альбо жаночы (Ж)

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

FAPSU 9. (2019). Ж., 1935 г.н., г. Дзісна, Мёрскі р-н.
FAPSU 10. (2019). Ж., 1936 г.н., в. Папшулі, Мёрскі р-н.
FAPSU 11. (2010). Ж., 1926 г.н., в. Шо, Глыбоцкі р-н.
FAPSU 12. (2014). Ж., 1935 г.н., в. Астроўна, Бешанковіцкі р-н.
FAPSU 13. (2017). Ж., 1926 г.н., в. Пуканаўка, Полацкі р-н.
FAPSU 14. (2008). Ж., 1932 г.н., в. Жукі, Шаркаўшчынскі р-н.
FAPSU 15. (2017). Ж., 1935 г.н., в. Светлічашча, Шумілінскі р-н.
FAPSU 16. (2010). Ж., 1928 г.н., в. Шо, Глыбоцкі р-н.
FAPSU 17. (2007). Ж., 1937 г.н., в. Ладасна, Лепельскі р-н.
FAPSU 18. (2010). М., 1930 г.н., в. Шо, Глыбоцкі р-н.
FAPSU 19. (2010). Ж., 1928 г.н., в. Кублічы, Ушацкі р-н.
FAPSU 20. (2019). Ж., 1939 г.н., г. Дзісна, Мёрскі р-н.
FAPSU 21. (2009). Ж., 1926 г.н., в. Бірулі, Докшыцкі р-н.
FAPSU 22. (2019). Ж., 1928 г.н., в. Цвеціна, Мёрскі р-н.
FAPSU 23. (2014). Ж., 1927 г.н., в. Соржыца, Бешанковіцкі р-н.
FAPSU 24. (2019). Ж., 1929 г.н., г. Дзісна, Мёрскі р-н.

Studies

Bartuška, Mark. (2014). *Partyzanskaâ vajna ŭ Belarusì ŭ 1941–1944 gg*. Smalensk: Ìnbelkul′t. [Бартушка, Марк. (2014). *Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг*. Смаленск: Інбелкульт].

Chiary, Berngard. (1996). Ustnye svidetel′stva Vtoroj mirovoj vojny. *Sociologičeskij žurnal*, 3–4. s. 246–257. [Кьяри, Бернгард. Устные свидетельства Второй мировой войны. *Социологический журнал*, 3–4, с. 246–257].

Chiary, Berngard. (2008). *Štodzennasc′ za lìnìâj frontu: akupacyâ, kalabaracyâ ì supracìŭ u Belarusì (1941–1944 g.)*. Smalensk: Ìnbelkul′t. [К'яры, Бернгард. (2008). *Штодзённасць за лініяй фронту: акупацыя, калабарацыя і супрацiў у Беларусі (1941–1944 г.)*. Смаленск: Інбелкульт].

Detstvo vojny 1941–1945 gg.: živye svidetel'stva Belarusi. (2011). Sostaviteli L.A. Aleksandrenko, K.I. Kozak, T.A. Kuz′mičeva. Minsk: Logvinov. [*Детство войны 1941–1945 гг.: живые свидетельства Беларуси*. (2011). Составители Л.А. Александренко, К.И. Козак, Т.А. Кузьмичева. Минск: Логвинов].

Engelking, Anna. (2018). Skaz polesskogo sela, ili o fol′klorizacii pamâti o Vtoroj mirovoj vojne. *Slavânovedenie*, 6, s. 27–46. [Энгелькинг, Анна. (2018). Сказ полесского села, или о фольклоризации памяти о Второй мировой войне. *Славяноведение*, 6, с. 27–46].

Engelking, Anna. (2021). „Our own traitor" as the Focal Point of Belarusian Folk Narrative on Local Perpetrators of the Holocaust. In: Natalia Aleksiun and Hana Kubátová (eds.). *Places, Spaces, and Voids in the Holocaust*. Vol. 3, pp. 219–258. München: Wallstein Verlag.

Kormina, Žanna; Štyrkov, Sergej. (2005). Nikto ne zabyt, ničto ne zabyto. Istoriâ okkupacii v ustnyh svidetel′stvah. V: Mihail Gabovič (red.). *Pamât' o vojne 60 let spustâ: Rossiâ, Germaniâ, Evropa* (s. 222–240). Moskva: Novoe literaturnoe obozrenie. [Кормина, Жанна; Штырков, Сергей. (2005). Никто не забыт, ничто не забыто. История оккупации

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

в устных свидетельствах. В: Михаил Габович (ред.). *Память о войне 60 лет спустя: Россия, Германия, Европа* (с. 222–240). Москва: Новое литературное обозрение].

Kurkowska-Budzan, Marta. (2016). Pospehì ì prablemy vusnaj gìstoryì ŭ Pol′ščy. U: Alâksandr Smalânčuk (red.). *Homo Historicus 2016. Gadavik antrapalagičnaj gistoryi* (s. 163–171). [Куркоўска-Будзан, Марта. (2016). Поспехі і праблемы вуснай гісторыі ў Польшчы. У: Аляксандр Смалянчук (рэд.). *Homo Historicus 2016. Гадавік антрапалагічнай гісторыі* (с. 163–171)]. Vil'nia: Belaruski kalegium.

Litvin, Aleksej. *Mestnaâ vspomogatel'naâ policiâ na territorii Belarusi (iûl' 1941 – iûl' 1944 gg.)*. [Литвин, Алексей. *Местная вспомогательная полиция на территории Беларуси (июль 1941 – июль 1944 гг.)*]. Pobrano z: http://jewishfreedom.org/page647.html (dostęp: 25.05.2022).

Mironowicz, Eugeniusz (2015). *Wojna wszystkich ze wszystkimi. Białoruś 1941–1944*, Kraków: Avalon.

Musâl, Bogdan. (2018). *Saveckìâ partyzany ŭ 1941–1944 gg. Mify ì rèčaìsnasc′*. Smalensk: Ìnbelkul′t. [Мусял, Богдан. (2018). *Савецкія партызаны ў 1941–1944 гг. Міфы і рэчаіснасць*. Смаленск: Інбелкульт].

Rebrova, Irina. (2014). Mir detskoj povsednevnosti v usloviâh okkupacii severnogo Kakaza. *Vestnik Permskogo universiteta. Istoriâ*, 2, s. 80–89. [Реброва, Ирина. (2014). Мир детской повседневности в условиях оккупации северного Каказа. *Вестник Пермского университета. История*, 2, с. 80–89].

Ryblova, Marina, et al. (2015). *Detstvo i vojna: kul'tura povsednevnosti, mehanizmy adaptacii i praktiki vyživaniâ detej v usloviâh Velikoj Otečestvennoj vojny (na materialah Stalingradskoj bitvy)*. Volgograd: Izd-vo FGBOU VO RANHiGS. [Рыблова, Марина и др. (2015). *Детство и война: культура повседневности, механизмы адаптации и практики выживания детей в условиях Великой Отечественной войны (на материалах Сталинградской битвы)*. Волгоград: ФГБОУ ВО РАНХиГС].

Smalânčuk, Alâksandr. (2016). Tragedyâ Halakostu ì âgo pryčyny ŭ vusnaj gìstoryì. U: Alâksandr Smalânčuk (red.). *Homo Historicus 2016. Gadavik antrapalagičnaj gistoryi* (с. 172–183). [Смалянчук, Аляксандр. (2016). Трагедыя Халакосту і яго прычыны ў вуснай гісторыі. У: Аляксандр Смалянчук (рэд.). *Homo Historicus 2016. Гадавік антрапалагічнай гісторыі* (с. 172–183)]. Vil'nia: Belaruski kalegium.

SUBMITTED: 13.03.2023
ACCEPTED: 17.10.2023
PUBLISHED ONLINE: 1.02.2024

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Uladzimir Lobach / Уладзімір Лобач – Białoruś, Połock; badacz niezależny; prof. dr hab.; *specjalność*: etnologia; *zainteresowania naukowe*: kultura ludowa Białorusinów, geografia sakralna, etnostereotypy, antropologia wojny.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 16/10/2026 04:53:53

Adres: ul. Sosnowa 1, 05–500 Piaseczno, Polska

Wybrane publikacje:

1. Лобач, Уладзімір. (2013). *Міф. Прастора. Чалавек: беларускі традыцыйны ландшафт у семіятычнай перспектыве.* Мінск: Тэхналогія.
2. Лобач, Уладзімір. (2017). Курганы, гарадзішчы, скарбы: «вясковая археалогія» на тэрыторыі Віцебшчыны ў XIX–XX стст. *Беларускі фальклор: матэрыялы і даследаванні*, 4, с. 10–39.
3. Lobach, Uladzimir. (2019). German Soldiers in the Period of the Nazi Occupation in the Memories of the Belarusian Villagers. *Studia Białorutenistyczne*, 13, pp. 72–89.
4. Лобач, Уладзімір. (2020). 1941 год вачыма дзяцей і падлеткаў Віцебшчыны: антрапалагічны дыскурс ваеннай гісторыі. *Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*, 9, с. 88–97.
5. Лобач, Уладзімір. (2022). "Свае–чужыя" латышы ва ўспамінах беларусаў Віцебшчыны. In: Mirosław Jankowiak, Kiryl Kascian (ed.). *In the shadow of others. Belarusian-Latvian relations from the past to nowadays* (pp. 185–200). Praha: Slovanský ústav AV ČR.
.